

# КІРЫЛА МАЗУРАЎ (1914—1989):

## *Яго выбраў час*

З партыйна-гаспадарчых і савецкіх кіраўнікоў самага рознага рангу і маштабу ў нашай айчыннай гісторыі ён займае адно з адметных месцаў. І не без падстаў на тое. Па-першае, Кірыла Трафімавіч узначальваў самыя розныя ўчасткі партыйнай, савецкай і гаспадарчай дзейнасці ў надзвычай складаны і неадназначны час — перад пачаткам, у ходзе і пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны; а, па-другое, галоўны ўчастак кіраўніцтва — рэспубліканскую партыйную арганізацыю Мазураў узначальваў даволі-такі працяглы час — амаль што дзесяць гадоў!

Кірыла Мазураў нарадзіўся ў вёсцы Рудня Прыбыткоўская Гомельскага раёна. Пасля школы скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум і ў 1933-м пачаў самастойную жыццёвую біяграфію: спачатку тэхнікам, а потым — начальнікам Камарынскага раённага дарожнага аддзела. З 1936-га па 1939-ы — у Чырвонай Арміі і ў палітаддзеле Беларускай чыгункі.

У неспакойным 1939-м, калі «ў паветры» ўжо адчуваўся подых вайны, Кірылу Мазурава накіроўваюць на працу ў камсамол: загадчыкам аддзела Гомельскага абкама, потым — сакратаром Гомельскага гаркама, і нарэшце — першым сакратаром Брэсцкага абласнога камітэта камсамола. Да слоў маладога, адукаванага, палітычна «падкаванага» маладзёжнага лідэра ўважліва прыслухоўваліся юнакі і дзяўчаты. І гэта — не перабольшанне: неўзабаве час «дазволіць» спаўна праверыць, шматкрат пераправерыць яго важацкія якасці і арганізатарскія здольнасці.

З першых дзён Вялікай Айчыннай Кірыла трапляе на фронт. Прызначаецца палітруком роты, пазней — камандзірам батальёна, інструктарам палітаддзела 21-й арміі. Праз год пасля пачатку вайны яго адклікаюць у Маскву і пасля кароткатэрміновага інструктажу-вучобы ў верасні 1942-га накіроўваюць на акупіраваную тэрыторыю роднай Беларусі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі